**УДК 272-774-9(476) : 930.2 “18/19”**

# ЗАХАДЫ ДА СТВАРЭННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ АПІСАННЯЎ ПАРАФІЙ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX – XX стст.

***канд. гіст. навук К.В. СЫЦЬКО***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Минск)***

*Разглядаюцца спробы Рымска-каталіцкага касцёла на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX – XX стст. адлюстраваць праз адмысловыя гістарычныя крыніцы сваю гістарычную сувязь з сацыяльным і культурным жыццём мясцовага насельніцтва. Выдзяляюцца захады да стварэння ва ўлонні гэтай інстытуцыі твораў, якія пралівалі святло на гісторыю дробных адміністратыўных адзінак – парафій. Першым захадам можна назваць дэкрэт 1849 г. віленскага біскупа В. Жылінскага, які абавязаў усіх пробашчаў запоўніць анкету з 10 пытанняў. Анкета атрымала назву “Хроніка парафіяльнага касцёла”. Другая спроба адбылася ў пачатку XX ст. і прадстаўляла з сябе прапанову ананімнага святара ствараць гістарычныя наратывы, у якіх адлюстроўвалася штодзённае жыццё праз прызму касцёла. Трэцім захадам да стварэння прац па гісторыі парафій названа распрацаваная ў 1926 г. анкета са 101 пытання, якая паслужыла падставай для стварэння шэрагам святароў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. наратываў. Дадзеныя наратывы называліся „парафіяльнымі хронікамі” ці „манаграфіямі парафій”. Аналізуюцца крыніцы, якія паслужылі асновай гэтых дакументаў, робіцца вывад аб іх каштоўнасці для даследаванняў па гісторыі Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *Рымска-каталіцкі касцёл, парафія, крыніцазнаўства, хроніка, анкета-апытальнік.*

**Уводзіны.** Рымска-каталіцкі касцёл у Беларусі ва ўсе перыяды сваёй дзейнасці быў зацікаўлены ў стварэнні і развіцці дыскурсіўных практык, якія б адлюстроўвалі гістарычнасць існавання культу на беларускіх тэрыторыях. Падобныя практыкі павінны былі даць дадатковае абгрунтаванне легітымацыі дзейнасці рэлігійнай інстытуцыі, дэтэрмінаваць яе функцыянаванне з сацыякультурным жыццём пэўных мясцовасцей. У вузкім сэнсе гэта вылілася ў адмысловыя невялікія гістарычныя раздзелы ў актах візітацый і інвентарах, у шырокім сэнсе – у стварэнне вялікіх наратыўных прац, якія апісвалі гісторыі ордэнскіх супольнасцей ці асобна ўзятых парафій.

У выпадку з ордэнамі і кангрэгацыямі абазначаныя памкненні прывялі да паўсямеснага стварэння кляштарных хронік ужо ў XV – XVII стст. Ордэнская наратыўная традыцыя была амаль знішчана з падзеламі Рэчы Паспалітай, але працягнулася ў адзінкавых кляштарах да канца 1930-х гг. У якасці прыклада можна прывесці хроніку францысканцаў ва Удзеле а. Тадэвуша Рагалі-Завадскага [1], напісаную ў 1894–1915 гг., а таксама лідскую піярскую хроніку, якую стваралі тры невядомыя аўтары ў 1926 – 1939 гг. [2]. Парафіяльныя гістарычныя творы адрозніваюцца ад кляштарных і адметныя тым, што атрымалі штуршок да развіцця толькі ў сярэдзіне XIX ст. і вяліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі пераважна да 1939 г., а на тэрыторыі Польшчы вядуцца і зараз.

**Асноўная частка.** Першая спроба ўкаранення практык стварэння парафіяльных наратываў звязана з адмысловым дэкрэтам 1849 г., выдадзеным віленскім біскупам Вацлавам Жылінскім. Дэкрэт патрабаваў ад парафіяльных пробашчаў запаўнення своеасаблівай гістарычнай анкеты-апытальніка, якая налічвала 10 пытанняў [3, с. 118]. Анкета была памножана друкарскім метадам і атрымала назву “Хроніка парафіяльнага касцёла ў…(*святаром уласнаручна ўпісвалася назва населенага пункта*)”, хоць да такога віду гістарычных крыніц, як хронікі, ніякіх адносін не мела. Дадзенай гістарычнай крыніцы ўласцівы невялікі памер (1-2 старонкі), яна была ўніфікаванай і па схеме запаўнення нагадвала г. зв. “ведамасці аб стане касцёлаў” з пашыранай колькасцю пытанняў. Пробашчы абавязаны былі да першага студзеня 1850 г. запоўніць гэтую “хроніку” і адправіць канцлеру курыі. На сённяшні момант больш як 400 адзінак дадзеных гістарычных крыніц з парафій былых беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі, захаваліся ў фондзе чацвёртай бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта.

У пералік неабходных для запаўнення ў “хроніцы” звестак уваходзілі апісанні фундушаў на касцёл, гісторыя заснавання касцёла, звесткі аб школах, шпіталях, могілках, скляпах калятараў, званах, сакрыстыях, унутраным і знешнім аздабленні. Таксама прапаноўвалася пералічыць імёны знакамітых пробашчаў, звесткі аб колькасці парафіян, парафіяльных традыцыях і фестывалях. З анкет-апытальнікаў вынікае, што шмат якія святары падыходзілі да іх запаўнення выключна фармальным спосабам і падавалі вельмі кароткую інфармацыю, ці наогул займаліся адпіскамі. Так, асобным пунктам з’яўлялася графа з найбольш цікавымі ўспамінамі парафіян аб гістарычных падзеях і здарэннях. Як паказвае аналіз 80 “хронік”, у большасці выпадкаў святарамі ў дадзенай графе ўпісвалася, што ніякіх успамінаў у жыхароў няма, а гістарычныя звесткі “…даўніна з’ела…”. Гэта можа казаць аб тым, што пробашчы наўпрост не выконвалі патрабаванні анкеты і не задавалі пытанні вернікам. Запісы гістарычных успамінаў сустракаюцца ў адзінкавых выпадках. Так,

у ішкалдскай “хроніцы” запісаны ўспаміны мясцовых жыхароў аб тым, што касцёл некалі з’яўляўся кальвіністцкім зборам [4, арк. 1адв]. Цікавым з’яўляецца запіс кс. Казіміра Палутона у янаўскай “хроніцы” звестак аб тым, што двое парафіян “…прыкладна 100 гадоў таму…” (*г. зн. прыкладна ў 1749 г.*) падчас адной са службаў бачылі побач з галоўным алтаром прывід кс. Андрэя Баболі, закатаванага ў 1657 г. [5, арк. 1адв].

Не гледзячы на тое, што большасць святароў даслала гістарычныя крыніцы ў курыю, акцыя па запаўненні “хронік” у 1849 г. была адзінкавай і працягу не атрымала, бо наступныя за В. Жылінскім біскупы не былі зацікаўлены ў даследаваннях па гісторыі парафіяльных касцёлаў. Аб гэтым ускосна сведчыць другая спроба развіцця традыцыі вядзення ў парафіях гістарычных твораў, якая адбывалася не з дапамогай біскупскіх дэкрэтаў, а “знізу”. Яна была здзейснена ў 1900 г. ананімным каталіцкім святаром, які на старонках часопісу “Гамілетыка” заклікаў калег ствараць хронікі [6, с. 628]. Пад хронікамі на гэты раз меліся на ўвазе падрабязныя наратыўныя творы, якія б змяшчалі апісанне гісторыі парафіі ад моманту яе заснавання да моманту, сучаснага храністу. Падкрэслівалася, што гэтыя парафіяльныя крыніцы могуць быць значным матэрыялам у аргументацыі неабходнасці касцёла ў жыцці грамадства. Таксама адзначалася, што падобным чынам пробашчы могуць зрабіць свой унёсак у даследаванне канфесійнай гісторыі, бараніць тэрытарыяльную цэласнасць парафій, не дапускаць канфіскацыі маёмасці і г.д. Трэба думаць, што дадзеныя заклікі не былі шырока падтрыманымі супольнасцю святароў Віленскага біскупства, бо ўжо ў 1925 г. на старонках “Пастарскіх ведамасцей” нехта пад крыптанімам x. S. B. наракаў на адсутнасць наратыўнай гістарычнай традыцыі ў парафіях і прасіў біскупаў выдаць адмысловыя дэкрэты, якія б гэтую традыцыю стварылі і рэгламентавалі [7, с. 5]. Аб адсутнасці падтрымкі ідэй па стварэнні наратываў сведчыць і тое, што на сённяшні момант за перыяд з 1900 па 1925 гг. на тэрыторыі Беларусі вядома толькі 141-старонкавая парафіяльная хроніка шчучынскага касцёла, напісаная ў 1912–1918 гг. кс. Рамуальдам Свіркоўскім [8], а звесткі аб матэрыялах іншых беларускіх парафій адсутнічаюць.

Сітуацыя змянілася з прызначэннем на пасаду Віленскага арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага, які прыбыў у Вільню з Ломжы ў 1926 г. У гэтым жа годзе па асабістай ініцыятыве арцыбіскупа пачаў дзейнічаць камітэт па справах будовы і кансервацыі касцельных помнікаў, у які ўваходзіла адмысловая археалагічна-мастацкая секцыя. У складзе памянёнай секцыі лічыліся такія вядомыя асобы, як канонік Ян Курчэўскі; акадэмік Тадэўш Раствароўскі; прафесар Фердынанд Рушчыц; прафесар Станіслаў Яроцкі; канцлер курыі, канонік кафедральнай капітулы Адам Савіцкі; віленскі дэкан Антоні Чарняўскі; віленскі школьны прэфект Юзаф Сонгін; мастачка Браніслава Камінская і інш. Названымі асобамі створана новая гістарычная анкета-апытальнік, абавязковая для запаўнення парафіяльнымі святарамі. Анкета дзялілася на 18 інфармацыйных блокаў, якія сумарна налічвалі 101 пытанне. Усе пытанні можна падзяліць на тры вялікія групы – пытанні аб гістарычных падзеях у парафіі; пытанні, звязаныя з архітэктурай; пытанні аб аздабленні касцёла абразамі, фрэскамі, крыжамі і г.д. Для таго, каб спрасціць задачу запаўнення фармуляра дакумента, камісіяй да набыцця ў бібліятэкі касцёлаў прапаноўваўся шэраг гістарычных і мастацтвазнаўчых выданняў, якія павінны былі аказаць пробашчам дапамогу ў вызначэнні стыляў архітэктуры і апісанні гісторыі [9, арк. 1–3].

Некаторыя святары, сучаснікі гэтых падзей, адзначалі, што эфект ад стварэння анкеты-апытальніка быў не такім, як планавалася – шмат якія пробашчы адмаўляліся весці анкеты, ці рабілі гэта вельмі неаператыўна, успрымаючы падобнае як дадатковую папяровую працу [10, с. 4–5]. Некаторым пацвярджэннем дадзеных слоў з’яўляецца тое, што ў фондах Віленскай архідыяцэзіяльнай кансісторыі на сённяшні момант захавалася толькі каля 20 адзінак цалкам запоўненых крыніц, яшчэ некаторая частка рассеяна па парафіях і архівах правінцый розных ордэнаў.

Галоўнай адметнасцю памянёных анкет з’яўляецца адсутнасць уніфікацыі пры запаўненні і, як след – розная інфарматыўная напаўняльнасць і памеры. Гэта паўплывала на тое, што гістарычныя апытальнікі розных касцёлаў маюць розную гістарычную каштоўнасць. Напрыклад, пробашч парафіі ў Саракаполі Свенцянскага павету кс. Юзаф Уладзіслаў Сарасек склаў анкету на 2 старонках, адказваючы на пытанні вельмі лаканічна (*ў большасці выпадкаў – “так”, “не”*) [11], што ўводзіць невялікую колькасць дадзеных у навуковае поле даследчыка. Так, звесткі аб заснаванні парафіі падаюцца наступным чынам: “Касцёл пабудаваны ў 1775 г. У 1851 г. адбудаваны нанова на старым фундаменце”. Пры гэтым, не даецца інфармацыя аб фундатарах, ахвяраваных сумах грошай, выбітных калятарах [11, арк. 2адв.].

У сваю чаргу, пробашч парафіі ў Канстанцінава Мядзельскага павету кс. Аляксандр Лашакевіч распісаў у анкеце гісторыю парафіі больш падрабязна, сумарна яна налічвае 22 старонкі. А. Лашакевіч, апроч падрабязнага апісання гісторыі касцёла, апавядання пра ўсіх яго фундатараў, могілкі, алтары і інш., дадаў да крыніцы фотаздымкі касцельнага аздаблення, свой уласны фотапартрэт, падрабязны план парафіі, схемы пабудовы касцёла, замалёўкі яго галоўнага і бакавога фасадаў [12, арк. 18–24]. Са звестак аб фундацыі парафіі можна даведацца, што касцёл паўстаў у 1793 г. дзякуючы палкоўніку Ашмянскага павета Канстанціну Хавінскаму, унуку Людвіка Хавінскага. У 1826 г. аднаўленнем касцёла, фундацыяй на яго грошай і стварэннем сямейнага склепа займаліся Пашкевічы. У дадзеным раздзеле прыводзіцца шмат звестак і аб іншых сем’ях фундатараў і калятараў [12, арк. 6адв.], сам раздзел значна больш падрабязны за аналагічны з саракапольскай анкеты.

Акцыя па запаўненні гістарычных анкет не атрымала масавай падтрымкі сярод пробашчаў, аднак паклала пачатак стварэнню шэрагам ксяндзоў, якія гэтыя дакументы запаўнялі, наратыўных апавяданняў аб гісторыі парафій. У розных мясцовасцях дадзеныя наратывы мелі розную назву – "манаграфія парафіі", "парафіяльная хроніка", "касцельная хроніка", "апісанне парафіі", "гісторыя парафіі", "ведамасці аб парафіі" і інш. На сённяшні момант вядомы падобныя творы з Жырмун, Волдацішак, Свянцян, Парэчча (Гродзенскага павету), Ражанкі, Рымшан, Канстанцінава, Ішчальны, Рэплі, Дудаў, Нараўкі і шмат інш. населеных пунктаў. Агульнымі для іх асаблівасцямі з'яўляецца дата стварэння (*паміж 1930 і 1939 гг.*), а таксама тое, што пробашчы, пры пабудове логікі наратыву, карысталіся ў якасці макета апісанымі вышэй анкетамі-апытальнікамі. Галоўным адрозненнем ад анкет з'яўляецца адсутнасць строгай прывязкі да парадку падачы інфармацыі (*структурныя часткі маглі размяшчацца ў тэксце адвольным парадкам; некалькі структурных частак маглі зліваецца ў вялікія раздзелы і г.д.*), а таксама больш вольны стыль напісання тэксту і спробы звязаць кожную з частак паміж сабой не толькі храналогіяй, але і сюжэтнай лініяй. У прыватнасці, з мэтай атрымання больш звязнага твору, апускалася дыскрэтная манера апавядання, уласцівая анкетам. Большасць названых гістарычных твораў, за выключэннем надрукаванай невялікім накладам гісторыі Жырмунскага касцёла, захавалася толькі ў адным асобніку ў рукапісным выглядзе [10, с. 2].

Пасля аналізу названых вышэй дакументаў, было ўстаноўлена, што яны маюць прыкметы, якія дазваляюць аднесці іх да віду "хронік і летапісаў". Так, Акадэмік М.М. Ціхаміраў называў галоўнай прыкметай летапісання і вядзення хронік дзяленне твора па гадах, а летапіс называў "асаблівым відам гістарычнага апавядання, падзеленага па гадах" [13, с. 7]. М.М. Улашчык называў хронікай любое цэльнае паслядоўнае апісанне гістарычных падзей ад моманту зараджэння пэўнай з'явы да моманту, сучаснага храністу [14, с. 7]. Па гэтай прыкмеце М.М. Улашчык вызначаў запісаныя ў храналагічным парадку звесткі аб гісторыі шэрагу беларускіх гарадоў як "гарадскія хронікі" (*самы позні запіс якіх датуецца 1867 г. і адносіцца да хронікі Магілёва*) [14, с. 173–202]. Адпаведна, запісаныя ў храналагічным парадку звесткі аб гісторыі рымска-каталіцкіх парафій можна называць "Парафіяльнымі хронікамі", не гледзячы на адсутнасць уніфікацыі ў назвах.

Найбольш яскравым прыкладам падобнага наратыву з'яўляецца 197-міаркушны твор аб гісторыі парафіі ў Дудах Лідскага павету, напісаны пробашчам Сыкстам Ганусоўскім у 1934 г. [15]. Тэкст з'яўляецца тыповым і падобным па інфармацыйных якасцях на іншыя парафіяльныя манаграфіі і хронікі, але значна большым за іх па памеры за кошт увагі кс. Ганусоўскага да апісання дробных дэталяў. Манаграфія парафіі ў Дудах змяшчае падрабязнае гістарычнае апісанне парафіяльнага жыцця, падзеленае па прадметным прынцыпе на некалькі важных структурных частак: апісанне тэрыторыі парафіі, якое ўтрымлівае апісанне лясоў, балот, сенажацяў, рэк, азёраў, населеных пунктаў, глебы і г.д.; апісанне насельніцтва, уключаючы рыма-каталікоў, акаталікоў і іншаверцаў; апісанне парафіяльных звычаяў і забабонаў; апісанне кулінарных традыцый; апісанне пабудоў і промыслаў; гісторыя найстаражытнейшых мясцовых шляхецкіх родаў; апісанне буйнейшых населеных пунктаў; апісанне школ і мясцовых каталіцкіх ордэнаў і ініцыятыў; гісторыя мясцовага парафіяльнага касцёла; апісанне званіц, арганаў, алтароў, абразоў, фігур; гісторыя мясцовых могілак; апісанне парафіяльнага шпіталя; гісторыя мясцовага брацтва; пералік усіх ксяндзоў і вікарыяў, якія служылі ў парафіі; пералік адзінак захавання парафіяльнага архіва. Да рукапісу кс. Ганусоўскі дадаў падрабязны алфавітны паказчык, па якім у тэксце можна знайсці апісанне той ці іншай асобы, з'явы ці прадмета.

Манаграфія парафіі ў Дудах, як вынікае з уступа, напісана паводле матэрыялаў парафіяльнага архіву, успамінаў мясцовых жыхароў, а таксама з дапамогай шырокага выкарыстання твораў Іпаліта Корвін-Мілеўскага [15, арк. 1]. Выкарыстанне падобнага спалучэння крыніц інфармацыі з'яўляецца тыповым для ўсіх парафіяльных хронік і манаграфій Беларусі без выключэння. Так, кс. Казімір Генрык Васілеўскі з Волдацішак сцвярджаў, што напісаў гісторыю парафіі ў 1938 – 1939 гг. "…на падставе ляжачых у парафіі дакументаў і ведамасцей, сабраных ад парафіян…" [16, арк. 2], а кс. Тамаш Калінскі ў 1932 г. пісаў, што стварыў манаграфію парафіі Нараўка з дапамогай "...сціплага збору парафіяльнага архіва, апавяданняў парафіян аб сівым веку, а таксама дзякуючы ўласнымназіранням…" [17, арк. 20].

Успамінам мясцовых жыхароў, якія выкарыстоўваліся ў працах, уласціва паўлегендарнасць і адсутнасць крытычнага аналізу [18, с. 242– 243]. Напрыклад, паводле народных успамін у Шчучыне служыў кс. Барталамей Лянкевіч, які вельмі моцна любіў парафіян і шчыра спачуваў ім. Ён, паводле крыніцы, моцна перажываў з-за смерці доктара Жахоўскага (*ініцыялы невядомы*). Падчас адпявання у 1874 г. пачаў маліцца перад алтаром. Доўгі час кс. Лянкевіч стаяў укленчыўшы ў малітвенай позе, не падымаў галавы і не ўставаў з кален. Калі да яго падышлі, каб сказаць аб заканчэнні службы, то аказалася, што пробашч памёр [8, арк. 221].

Для апісання парафіян святары актыўна выкарыстоўвалі ўласныя назіранні. Так, кс. Ганусоўскі апісвае жыхароў Дудаў наступным чынам: "Людnасць мясцовая, і жанчыны і мужчыны, вельмі нязграбныя; у руху лянівыя і спакойныя. Твары маюць пахмурныя і смутныя. Заўжды прыгнечаныя, заўжды задуменныя і пераважна апатычныя… Не знойдзеш у іх ніякай шчырасці і весялосці. Калі і пасміхаюцца, то толькі злобна

і іранічна. Сардэчна смяяцца не ўмеюць…” [15, арк. 10–10адв.]. Варта заўважыць, што падобнае негатыўнае апісанне мясцовых жыхароў не з’яўляецца выключэннем і для іншых парафій. Вялікая колькасць пробашчаў падкрэслівала ў хроніках негатыўныя рысы парафіян, не апісваючы нейкія станоўчыя якасці. Напрыклад, кс. Фларыян Нявера называў характар жыхароў Жырмун “спекулятыўным” [10, с. 74], не даючы раскрыцця гэтаму тэрміну, а кс. Томаш Калінскі наракаў, што нараўскія парафіяне бедныя як матэрыяльна, так і духоўна, а больш за ўсё любяць “…гулянкі, якія часцей канчаюцца п’янымі бойкамі…” [17, арк. 5]. Трэба думаць, што заганы парафіян запісваліся для таго, каб выкарыстоўваць іх у гаміліях і паказваць магчымыя шляхі да выкаранення грахоў з жыцця паводле Святых пісанняў.

Спалучэнне дакументаў парафіяльных архіваў, твораў гісторыкаў, народных успамінаў і ўласных назіранняў дазваляла пробашчам стварыць крыніцу, звесткі якой фіксавалі мясцовае жыццё выключна вакол рэлігійнай інстытуцыі, што дазваляла казаць аб гістарычнасці касцёла і цеснай сувязі яго з сацыяльным і культурным развіццём мясцовасці.

З мэтай укаранення фактаў з хронік у свядомасці насельніцтва, яны актыўна папулярызаваліся. Пра падобнае сведчыць шэраг успамінаў святароў і жыхароў парафій, у якіх ствараліся гістарычныя наратывы. Так, у бібліятэцы імя Асалінскіх ва Уроцлаве захаваліся мемуары Караля Ляськовіча, які ў 1930-я гг. жыў у Ішчальне Шчучынскага павету. Ляськовіч згадваў хроніку ішчальнскага касцёла, якая, па яго словах, была надзвычай каштоўным дакументам. Сшытак з рукапісам бераглі як кнігу набажэнстваў і захоўвалі ў сакрыстыі, куды не было допуску староннім асобам. Фрагменты хронікі зачытвалі ў касцёле падчас гамілій, урачыстых падзей, выкарыстоўвалі для адукацыі дзяцей у парафіяльных школах [19, арк. 47].

З аб’яднаннем Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. стварэнне падобных твораў было фактычна спынена па прычыне ідэалагічнага ціску на касцёл і высылкі шэрага святароў, якія пісалі гісторыю мясцовых парафій. Адным з нешматлікіх выключэнняў з’яўляецца згаданая вышэй хроніка ішчальнскай парафіі, вядзенне якой спарадычна прадаўжалася з 1932 г. да пачатку 2000-х гг. у нязменным выглядзе [20, арк. 40–42].

**Заключэнне.** Такім чынам, Рымска-каталіцкі касцёл у сярэдзіне XIX – XX стст. зрабіў некалькі захадаў да стварэння гістарычных апісанняў усіх існуючых на той момант парафій. Па форме дадзеныя апісанні былі прадстаўлены анкетамі-апытальнікамі, якія прапаноўваліся курыямі для запаўнення святарам у 1849 і 1926 гг., а таксама вялікімі наратыўнымі творамі, якія з’яўляліся прыватнай ініцыятывай ксяндзоў. Дадзеныя творы, у залежнасці ад мясцовасці, мелі назву “манаграфія парафіі”, “гісторыя парафіі”, “парафіяльная хроніка”, “касцельная хроніка” і інш. Устаноўлена, што па спосабу падачы інфармацыі іх можна адносіць да такога віду крыніц, як “хронікі і летапісы”. Феномен вядзення парафіяльных хронік на тэрыторыі Заходняй Беларусі доўжыўся да 1939 г., а ў выпадку з ішчальнскай хронікай – да пачатку 2000-х гг. У дадзеных гістарычных крыніцах на падставе матэрыялаў парафіяльных архіваў, прац вядомых аўтараў, успамінаў мясцовых жыхароў і асабістых назіранняў святароў апісвалася штодзённае жыццё асобна ўзятай мясцовасці. Дадзеная акалічнасць робіць парафіяльныя хронікі каштоўным матэрыялам па гісторыі Беларусі і патрабуе іх падрабязнага крыніцазнаўчага, кадыкалагічнага і тэксталагічнага аналізу.

## ЛІТАРАТУРА


1. Archiwum Prowincji Franciszkanów w Krakowie (OFMConv). – Sygn. ApLit/C-1.
2. Archiwum Polskiej Prowincji Zakonu Pijarów w Krakowie (APPZPK). – Sygn. Col. Lid. 5.
3. Krahel, T. "Kronika" kościoła farnego w Grodnie / T. Krahel // Rocznik Teologii Katolickiej. – 2003. – Nr. 2. – S. 117–123.
4. Vilniaus universiteto biblioteka (далей – VU Biblioteka). Rankraśćiu skyrius. – F. 4. B. F4-(A2695)36030.
5. VU Biblioteka. Rankraśćiu skyrius. – F. 4. B. F4-(A2914)36244.
6. P. K. (Odszyfrowanie nieznane) Kronika parafialna / K. P. // Homiletyka. – 1900. – R. 3. – T. 5. – S. 627–630.
7. B. S. (Odszyfrowanie nieznane) O ważności założenia i prowadzenia kroniki parafjalnej / S. B. // Wiadomości Pasterskie: dodatek do Miesięcznika Kościelnego. – 1925. – R. 2. – Nr. 2. – S. 4-6.
8. Архіў калегіума піяраў і парафіі Найсвяцейшай Тэрэзы Авільскай ў г. Шчучын. – Адз. зах. Kronika parafjalna Szczyńskiego Kościoła.
9. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі). – Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 24. Воп. 1. Спр. 1127.
10. Niewiero, F. Historia kościola parafialnego w Żyrmunach (1522–1624–1788–1938) / F. Niewiero. – Lida, 1939. – 104 s.
11. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей – LVIA). – F. 694. Ap. 5. B. 4067.
12. LVIA. – F. 694. Ap. 5. B. 2059.
13. Тихомиров, М. Н. Русское летописание / М. Н. Тихомиров. – М. : Наука, 1979. – 556 с.
14. Улащик, Н.Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н.Н. Улащик. – М. : Наука, 1985. – 261 с.
15. LVIA. – F. 694. Ap. 5. B. 1246.
16. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3С. Воп. 25. Спр. 1.
17. Kaliński, T. Monografia parafii Narewka, 1932, mps. // Parafia świętego Jana Chrzciciela w Narewce [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://www.narewka.archibial.pl/files/Historia_parafii_Narewka.pdf. – Data dostępu: 22.12.2019.

18. Сыцько, К.В. Парафіяльная хроніка Ішчальнскага касцёла / К.В. Сыцько // Беларускі гістарычны агляд. – 2018. – Т. XXV. – Сш. 1-2. – С. 215–245.
19. Zakład narodowy im. Ossolińskich (ZNIO). – Sygn. 15480.
20. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 1.

*Пастyпiў 19.02.2020*

**ATTEMPTS TO CREATE HISTORICAL DESCRIPTIONS OF THE PARISHES OF THE ROMAN CATHOLIC CHURCH IN BELARUS IN THE MIDDLE XIX – XX CENTURIES**

***K. SYTSKO***

*We consider the attempts of the Roman Catholic Church in Belarus in the middle of the XIX – XX centuries. reflected through the special historical sources of their historical relationship with the social and cultural life of the local population. Stand out measures to create in the bosom of this institution works that shed light on the history of small administrative units – parishes. The first step can be called a decree in 1849 Vilna Bishop V. Žilinski, which obliged all the abbots fill out a questionnaire of 10 questions. Profile called "Chronicle of the parish church." The second attempt took place in the early twentieth century. and is a proposal to create an anonymous priest historical narratives that reflect the daily life through the prism of the church. The third step to the creation of works on the history of parishes called developed in 1926. The questionnaire with 101 issues that were the basis for the creation of a number of Western Belarus priests in the 1930s. narratives. These narratives were called "parish chronicles" and "monographs parishes". Analyzes the sources, which form the basis of these documents, the conclusion of their value for research on the history of Belarus.*

***Keywords:*** *Roman Catholic Church, parish, source criticism, chronicle, questionnaire.*